УДК 378.1

А. А. Райчонак, ст. выкладчык

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ЯК СРОДАК ГРАМАДСКАГА, ПАТРЫЯТЫЧНАГА І НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ

The problems of teaching of Byelorussian history at the University are regarded in the article. The possibilities of its educational potential are characterized and some guidelines for their uses are given.

**Уводзіны.** Грамадзянская адукацыя – гэта адукацыя грамадзяніна сваёй краіны. Галоўнай мэтаю сістэмы адукацыі любой краіны з'яўляецца фармаванне грамадзяніна – патрыёта. Без гэтага немагчыма існаванне самой дзяржавы.

У сучасных умовах адной з актуальных праблем, якія стаяць перад вышэйшай школай, з'яўляецца праблема выхавання грамадзяніна незалежнай Беларусі. У рашэнні гэтай праблемы асаблівую значнасць мае гісторыя. Сам змест курса гісторыі дае вакладчыку такую магчымасць.

**Асноўная частка.** На занятках па гісторыі Беларусі студэнты знаёмяцца з важнейшымі падзеямі і фактамі ў гісторыі чалавецтва, у іх выпрацоўваюцца ўменні самастойна арыентавацца ў падзеях і ацэньваць іх. Вывучэнне гісторыі Беларусі ў кантэксце ўсеагульнай гісторыі стварае асабліва спрыяльныя ўмовы для патрыятычнага выхавання. Патрыятычны светапогляд звычайна грунтуецца на гістарычнай памяці, на ўспамінах пра найбольш яркія падзеі мінулага народаў розных краін і сваёй Айчыны.

Патрыятычнае выхаванне будзе эфектыўным, калі выкладчык даб'ецца цэласнай сувязі паміж фактамі і з'явамі, якія адлюстроўваюць патрыятызм і гераізм людзей. На наш погляд, патрыятычнае выхаванне студэнта залежыць не толькі ад таго, наколькі ён запомніць дэталі гістарычных падзей, а ў першую чаргу ад яго здольнасці даваць ім маральную ацэнку, самастойна рабіць светапоглядныя вывады.

На наш погляд, самае галоўнае – пазбегнуць фармалізму ў арганізацыі выхаваўчай работы. Выкладчыку нічога не трэба прыдумваць, калі загадзя вядома, што гэта не будзе выканана. Лепш выбраць такія формы, якія будуць зразумелыя маладым людзям, тады яны будуць самі іх арганізатарамі і ўдзельнікамі. Для арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы могуць служыць памятныя, юбілейныя даты, дзяржаўныя святы і традыцыі універсітэта.

Асобнае месца ў курсе гісторыі мае раздзел «Другая сусветная вайна. Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза». Тут трэба старацца закрануць думкі і пачуцці студэнтаў, каб яны ўявілі той час, убачылі гора людзей, а затым адчулі радасць перамогі нашых дзядоў.

Ва універсітэце выдзяляецца час на правядзенне факультатыўных або дадатковых заняткаў. Іх трэба паставіць на новы ўзровень, каб рашаць не толькі задачы паглыблення ведаў, але і фарміраваць уласны пункт погляду студэнтаў на гістарычныя падзеі, выхоўваць іх грамадзянскую пазіцыю. Выкладчык, зыходзячы з патрэбнасцей студэнтаў, сам вырашае, па якой праблематыцы праводзіць такія заняткі.

Вялікае значэнне для выхавання ў студэнтаў калектывізму і патрыятызму маюць краязнаўчыя экскурсіі, падарожжы па родным краі. Краязнаўства дае вялікія магчымасці выкладчыку выхоўваць сапраўдных патрыётаў. Добра вядома яшчэ і тое, што патрыёт Бацькаўшчыны пачынаецца з патрыёта ўніверсітэта. Удзел студэнта у рабоце савета факультэта, развіццё студэнцкага самакіравання, дзейнасць грамадскіх маладзёжных арганізацый, клубы – усё гэта стварае ўмовы для выхавання грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны.

Закладзеныя ў змесце універсітэцкага курса гісторыі выхаваўчыя магчымасці трэба яшчэ рэалізаваць. А таму неабходна прадуманая сістэма выкладання, заснаваная на ўзаемасувязі і ўзаемадапаўненнях навучання і выхавання, вучэбнай і самастойнай работы.

Выкладчык павінен правільна вызначыць выхаваўчыя задачы кожнай тэмы і кожнага занятку. Трэба паставіць канкрэтныя выхаваўчыя задачы і вызначыць умовы іх ажыццяўлення. Адна з важнейшых умоў – адбор яркіх пераканаўчых фактаў. І затым, напэўна, самае цяжкае – выбраць метадычныя спосабы і сродкі іх даходлівага эмацыйнага раскрыцця .

Для паспяховай арганізацыі сістэмы грамадзянска-патрыятычнага выхавання настаўнікам неабходна прымаць самы актыўны ўдзел у рэалізацыі Рэспубліканскай праграмы патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі, у якой раскрыта ідэалагічная аснова патрыятызму ў Рэспубліцы Беларусь і вылучаны задачы і змест патрыятычнага выхавання, прынцыпы іх рэалізацыі.

**Заключэнне.** Сапраўды, наша сістэма адукацыі павінна служыць нашым нацыянальным інтарэсам – будаванню невялікай неамбіцыйнай немілітарызаванай дэмакратычнай дзяржавы, інтэграванай у еўрапейскую і сусветную эканамічную і культурную прастору.